**Кацярына Грынько,**
вучаніца 9 класа
гімназіі № 3 г. Магілёва

**Боль у сінім сшытку: успаміны пра вайну**

Кожнае лета на канікулах я бываю ў вёсцы ў бабулі і дзядулі. І там я знайшла стары сіні сшытак, спісаны незнаёмым почыркам. У сшытку былі напісаны тэксты песень, якіх я ніколі не чула. Такія цікавыя, сапраўдныя народныя, жыццёвыя. Аказалася, што песні запісала маці маёй бабулі - мая прабабуля. А пасля песень у сшытку былі напісаны яе мемуары. Я прачытала запісы, і кранулі яны мяне да глыбіні душы, да болю, да слёз.

У сваіх успамінах прабабуля распавядае пра вайну, пра тое, што прыйшлося вынесці людзям, сагнаным на прымусовыя работы ў Германію. У час вайны яна была толькі трохі старэйшая за мяне. А мне - пятнаццаць. Я, як і ўсе мае аднагодкі, хаджу ў школу, праводжу час з сябрамі, займаюся цікавымі мне справамі, сяджу ў інтэрнэце, будую планы на будучыню.Мая прабабуля таксама марыла і ніяк не думала, што заўтрашні дзень будзе такім страшным ...

З успамінаў прабабулі: ”Калі мне было няпоўных шаснаццаць гадоў, пачалася вайна. Вайна - гэта страшнае слова. Яна прынесла вельмі шмат гора ўсім савецкім людзям. Немцы зверскі здзекаваліся над усімі, забівалі старых і дзяцей, а маладых забіралі і зганялі ў Нямеччыну... Аднойчы прыехалі да нас у вёску немцы, выгналі ўсіх жыхароў на вуліцу, забралі ўсю моладзь і пагналі нас на працы. Тады была ўведзена нейкая ”гуж - праца“. Кожны працаздольны павінен быў адпрацаваць на немцаў некалькі дзён. Але нас яны забралі перад самым адступленнем і больш дадому не пусцілі, прымушалі працаваць на іх дзень і ноч. Мяне з хаты забралі ў сакавіку 1944 года, у Германію нас прыгналі ў ліпені 1944 года. Прабыла я пад немцамі 10 месяцаў ...

... Ганялі нас будаваць ім дарогі для адступлення і капаць акопы. Працавалі мы пад кулямі, пад снарадамі. Ніхто з нас не думаў застацца ў жывых, так тады было страшна. Уцякаць не было ніякай магчымасці, яны вельмі ахоўвалі наш лагер, ахоўвалі нават з сабакамі. Некаторыя людзі спрабавалі ўцячы, але іх тут жа лавілі і прыводзілі назад. І тады ўвесь лагер выганялі на пабудову і перад намі, ”уцекачоў“ збівалі да паўсмерці , а потым расстрэльвалі. Неяк раз адзін пажылы немец нам сказаў: ”Дзяўчынкі не спрабуйце збегчы, яны вас усіх расстраляюць, ідзіце, куды вас гоняць, а вашы вас усюды знойдуць, нават у самой Германіі“. Так яно і здарылася ...

... Калі немцы адступалі, нас, савецкіх, гналі наперадзе сябе, па абодвух баках дарог. Дарогі былі замініраваныя нашымі партызанамі, і нас прымушалі прайсці першымі. Былі выпадкі, што нашы падрываліся на мінах ...

... Нас прагналі пешшу праз усю Беларусь у Польшчу. Прывялі да ракі Вісла і там, на беразе, трымалі цэлы тыдзень. На другім беразе была пабудавана нейкая ”перажарка“, накшталт лазні. Нас перапраўлялі на той бок і ўсіх распраналі, як маці нарадзіла, не гледзячы на пол, жанчына ці мужчына. І гналі усіх разам у лазню. Вопратку бралі і пяклі ці ледзь ні на вуголле, а потым

выносілі ўсё ў кучу, і кожны шукаў сваю. Пасля гэтай лазні мы не пазнавалі самі сябе, многіх стрыглі, баяліся вошай ... А потым пасялілі нас у лагер, тут нас фатаграфавалі і бралі адбіткі пальцаў. Павесілі кожнаму на шыю дошчачкі з літарамі ОСТ, іх нельга было здымаць ...

... У адным з пераездаў (нас тады везлі цягнікам ) мы спявалі такую песню: ”Вагон хістаецца, усё апускаецца, усё апускаецца маркотным сном. Краіна родная ўсё аддаляецца, ідзе ў Германію наш эшалон. Бывайце вуліцы роднага горада, бывайце, родныя бацька і маці. Вязуць у Нямеччыну на мукі голаду, вязуць у Германію нас паміраці“ .

Прывезлі нас у іншы лагер у горадзе Гале. Кармілі вельмі дрэнна, варылі бручку. А аднойчы ў сваім кацялку я знайшла шэршняў, не стала есці і нікому не сказала. Сядзела і глядзела на астатніх. Думала - хай людзі ядуць, яны ж не бачылі. Але многія знайшлі такую ”прыправу“ ў баландзе, павылівалі. Нас за гэта пакаралі і не далі есці наогул нічога ... Нямецкія жанчыны спачувалі нам, ці баяліся, таму што набліжаўся фронт. Часам немкі прыносілі нам ежу і вопратку, у асноўным дзецям. Нас, маладых, часта забіралі з лагера працаваць на палі. Аднойчы мы палолі гарох, трэба было па шэрагу два разы прайсці ”матыкай“, а я так стамілася і прайшла толькі раз. За гэты немец збіў мяне палкай. На працу нас вадзіў стары немец, здаецца, штурханула б яго, каб рассыпаўся. Але нельга – заб’юць ...

... Аднойчы працавалі мы на цукровым заводзе. ... І раптам трывога, бамбёжка, і нас пагналі ў бамбасховішча, а калі мы вярнуліся, то завода не было. І лагер таксама разбамбілі, не пазнаць, дзе чый барак стаяў. Загінула шмат людзей. У маёй сяброўкі забіла маці, у адной жанчыны - двое дзяцей, не знайшлі іх нават, каб пахаваць. Нас тут прымушалі раўняць ямы, выбітыя бомбамі, і раскопваць бомбы, якія не разарваліся.

Пасля адсюль павезлі ў іншы лагер, у горад Пархім . Кармілі адной баландай, ды такой, што есці немагчыма было. Але трэба было есці, паміраць галоднай смерцю не хацелася. Хаця многія паміралі. Раніцай, калі выходзіш з барака, часта можна было ўбачыць мёртвых жанчын ці мужчын. А яшчэ часта жанчыны схадзілі з розуму. Пад раніцу ў лагеры толькі і чуеш крыкі, плач і песні. Такіх жанчын забіралі і вывозілі, казалі, што іх спальвалі ў спецыяльных печах ...

... А потым нас павезлі ў горад Людвігсбург. Пасялілі недалёка ад горада ў маёнтку нейкага багатага бавара. І зноў ганялі на працы: капаць буракі, малаціць гарох, вазіць салому, чысціць жывёльныя двары. Мы працавалі разам з ваеннапалоннымі. Конь, на якім перавозілі салому, зламаў нагу, і нашага ваеннапалоннага за гэта збілі да паўсмерці... На працу хадзіць было далёка. Нам выдалі дзеравякі. Гэта такія чаравікі на тоўстай драўлянай падэшве. У іх было вельмі цяжка хадзіць. Снег ляпіўся на чвэрць падэшвы. Мы здымалі дзеравякі і беглі на працу па снезе ў адных шкарпэтках. Былі мы ў Баварыі нядоўга, усе зімовыя працы скончыліся і нас пагналі далей... У новым лагеры нас проста трымалі, не было куды ганяць на працы. Трэба было нешта есці, тады я стала гадаць на картах, дакладней казала, што прыйдзе мне ў галаву. У нашай

лагерфюрыхі (начальніца лагера) былі тры дачкі, яны мелі зносіны з намі, і я ім нешта там ”нагадала“, гэтыя дзяўчынкі расказалі знаёмым, і да мяне сталі хадзіць немкі. Ім таксама было гора, жанчыны ўсё аднолькавыя. У адной муж на вайне, у іншай - сын, жаніх ці брат. Усе яны плакалі, як і мы. Яны прыносілі нам ежу, і гэта было нам вялікай падтрымкай...

... Набліжалася вясна 1945 года, набліжаўся фронт. Немцы пачалі ўсіх эвакуіраваць, гналі і сваіх жыхароў, а наш лагер чамусьці не хацелі пакідаць ні нас, ні сваіх. Перадалі калоны эсэсаўцам. Нас гналі пешшу, а сваіх везлі на вазах. З намі цягнуліся і нямецкія абозы. Ішлі цэлымі днямі, без адпачынку. Шмат нашых падала, эсэсаўцы іх расстрэльвалі. Ідзеш і глядзіш па баках: людзі ляжаць ўздоўж дарогі, як дровы. Так крыўдна было, бо набліжаўся канец вайны. Яшчэ нас прымушалі несці чырвоны крыж - вялікае палотнішча метраў дзесяць. Мы так прыкрывалі нямецкія абозы. Але гэта не ратавала, усё роўна бамбілі, і ніхто не звяртаў увагі на нямецкія маскіроўкі. Мы тады думалі, што гэта апошні наш шлях. Пры бамбёжках ляжалі на зямлі і маліліся богу. Калі самалёты адляталі, было страшна глядзець на дарогу. Крыкі, стогны, маці галосяць над забітымі дзецьмі, дзеці - над маці. Было жудаснае відовішча. А нас гналі далей, насустрач ішлі амерыканцы, а за спіной падціскалі нашы ...

... Немцы здаліся амерыканскім салдатам. Нас амерыканцы павезлі ў свой тыл, зноў у лагер. Там нас проста трымалі, мы нават не ведалі , што 9 мая скончылася вайна. Пазней нам абвясцілі, што хто хоча, можа збірацца, і нас перадалі рускім, сваім. Нам здавалася, што мы ўжо і дома, так было радасна. Але дом быў далёка. Нас вазілі зноў па тых жа лагерах, дзе мы былі пад немцамі. Было вельмі шмат народу - 9 тысяч чалавек, усіх адразу адправіць дадому немагчыма, не хапала транспарту, былі разбураны жалезныя дарогі. Мы чакалі сваёй чаргі цэлых два месяцы. І аднойчы мы згаварыліся з дзяўчынкамі і вырашылі схадзіць у ягады ў кінутыя нямецкія дачы. Сабралася нас чалавек 20. І нас злавілі немцы з чырвонымі павязкамі на рукавах і са зброяй у руках. Такіх як мы, паляўнічых за ягадамі, было шмат. Усіх нас пагналі ў горад і замкнулі ў нейкую турму. Вось мы і паплакалі, думалі, што нашыя не знойдуць нас. Але знайшлі. Пабудавалі перад усім лагерам і прачыталі такую мараль , што мы тыдзень не выходзілі іх сваіх баракаў. Нам сказалі, што наша войска прыйшло ў Германію не рабаваць, а вызваляць і абараняць народ ад прыгнёту. Але мы не разумелі гэтага. Мы думалі, што гэта мы пацярпелыя, якія ўбачылі столькі страху, вытрымалі столькі болю, голаду і холаду. Было так крыўдна і сорамна, што за жменю нікому не патрэбных ягад ледзь не трапілі пад расстрэл...

... Вось прыйшла наша чарга адпраўляцца на радзіму. Колькі было радасці - не выказаць словамі. Гэта трэба перажыць. Пагрузіліся ў эшалон і адправіліся. І заспявалі песню: ”Вагон хістаецца, усё апускаецца, усё апускаецца вясёлым сном. Краіна злосная ўсё аддаляецца, ідзе на радзіму наш эшалон...“

Маю прабабулю звалі Шчэрбін Ганна Арцёмаўна. Яна вярнулася дадому з Германіі, выйшла замуж, нарадзіла чацвярых дзяцей, доўга і шчасліва жыла ў мястэчку Парычы Гомельскай вобласці. Дачакалася ўнукаў і праўнукаў. На

жаль, прабабулі ўжо няма побач з намі. Маю маму завуць Ганнай, а мяне прабабуля называла Катрынка.

На шчасце, пра тое, што такое вайна мы ведаем па расказах, фільмах і кнігах. Як ці можна было людзям вынесці такі цяжар на сваіх плячах? Як можна было не зламацца, працягваць жыць і дарыць жыццё?

Мы часам лічым, што ў нас ёсць нейкія праблемы, а часам ствараем іх самі на роўным месцы. Але ж у нас усё добра! Нам пашанцавала: мы жывем у мірны час. Мы вучымся, ездзім на экскурсіі, ходзім у паходы, адпачываем на летніх канікулах у аздараўленчых лагерах. Кожны займаецца тым, што яму падабаецца: спортам, музыкай, маляваннем, танцамі. Сёння мы - такія. У нас шчаслівае дзяцінства!